# § 46. Канфесійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.

РЭФАРМАЦЫЯ УНІЯЦКАЯ ЦАРКВА
КІРЫЛ ЦЯРЛЕЦКІ
МЯЛЕЦІЙ СМАТРЫЦКІ
КОНТРРЭФАРМАЦЫЯ ПЁТР СКАРГА
ПРАВАСЛАЎНЫЯ БРАЦТВЫ
ІПАЦІЙ ПАЦЕЙ ДЫСІДЭНТ
ІЯСАФАТ КУНЦЭВІЧ УНІЯ

Пагаршэнне становішча праваслаўнай царквы

**1. Становішча праваслаўнай царквы ў другой палове XVI ст.** Працэсы Рэфармацыі і Контррэфармацыі негатыўна паўплывалі на стан праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Актыўны пераход у пратэстантызм і каталіцтва прадстаўнікоў праваслаўнай шляхты пагоршыў матэрыяльнае становішча царквы, аслабіў яе падтрымку ва ўладных структурах, пазбавіў магчымасці бараніць свае інтарэсы. Нягледзячы на пэўныя поспехі, звязаныя з ураўнаваннем правоў праваслаўнай і пратэстанцкай шляхты згодна з прывілеямі Жыгімонта II Аўгуста 1563 г. і 1568 г., негатыўныя тэндэнцыі нарасталі. Ва ўмовах пашырэння рэнесанснай культуры, імкнення дваранства да заходнееўрапейскага ладу жыцця, узрослай цікавасці да асветы, разумення хрысціянскай веры праваслаўнаму духавенству было вельмі цяжка задаволіць новыя патрэбы паствы.

Успомніце, калі хрысціянская царква раскалолася на ўсходнюю (візантыйскую) і заходнюю (рымскую).

Праваслаўныя брацтвы

Ва ўмовах значнага скарачэння падтрымкі з боку феадальнай арыстакратыі на дапамогу царкве прыйшлі брацтвы — аб'яднанні праваслаўнай шляхты і мяшчан. У 1587 г. было заснавана Віленскае брацт-

ва, пазней такія ж брацтвы ўзніклі ў Магілёве, Брэсце і Мінску. Пры брацтвах ствараліся школы і тыпаграфіі, якія рабіліся цэнтрамі прыцягнення праваслаўных мысляроў.

**Аслабленне пазіцый праваслаўнай царквы**

Аднак сітуацыя ў самой праваслаўнай царкве была складаная. Права феадалаў самастойна прызначаць епіскапаў і святароў прывяло да ўзмацнення залежнасці духавенства ад свецкіх людзей. Кіеўскі мітрапаліт прызначаўся каралём Рэчы Паспалітай і валодаў вельмі сціплымі паўнамоцтвамі. Праваслаўная царква так і не была прадстаўлена ў вышэйшых дзяржаўных органах улады Рэчы Паспалітай, паступова ператваралася ў царкву сялянска-мяшчанскіх мас. Праваслаўныя архірэі пачалі пошукі шляхоў выхаду з крызісу.

## СТАНОВІШЧА ПРАВАСЛАЎНАЙ І КАТАЛІЦКАЙ ЦЭРКВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ




Ахарактарызуйце становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI ст.

**Ідэя царкоўнай уніі**

**2. Заключэнне Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі.** Ва ўмовах наступлення Контррэфармацыі ў інтэлектуальных колах грамадства адрадзілася ідэя заключэння царкоўнай уніі. Галоўным тэарэтыкам царкоўнай уніі ў Рэчы Паспалітай быў езуіт Пётр Скарга. У 1577 г. ён апублікаваў кнігу «Аб адзінстве Царквы Божай», у якой прапанаваў праваслаўнаму

духавенству выйсці з-пад улады канстанцінопальскага патрыярха і перайсці пад юрысдыкцыю Папы Рымскага, захаваўшы пры гэтым ранейшыя царкоўныя абрады.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

1. *Успомніце пра спробы аб'яднання каталіцкай і праваслаўнай цэркваў да 1596 г.*
2. *Чаму П. Скаргу называюць ідэолагам Брэсцкай (Берасцейскай) уніі?*
3. *Разгледзьце карціну польскага мастака Я. Матэйкі «Пропаведзь Скаргі». Паразважайце, якія аргументы мог прывесці выбітны палеміст і заняты прыхільнік каталіцызму на карысць ідэі уніі.*



*Пропаведзь Скаргі.*
*Мастак Я. Матэйка. 1864 г.*

Як вы лічыце, чаму ідэя аб'яднаць дзве царквы была рэалізавана менавіта на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у XVI ст.?

Знешнепалітычная сітуацыя спрыяла пашырэнню ідэі уніі ў асяродку не толькі каталіцкага, але і праваслаўнага епіскапату. Заключэнне царкоўнай уніі задаволіла многіх. Унія дала надзею праваслаўным архірэям палепшыць свае пазіцыі ў царкве

Падпісанне ЛЮБЛІНСКАЙ УНІІ → Заключэнне БРЭСЦКАЙ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь у лагічным ланцужку.

і дзяржаве, каталіцкаму духавенству — павысіць свой уплыў у традыцыйна праваслаўных рэгіёнах, а каралеўскай уладзе — панізіць напружанне міжнацыянальных канфліктаў у Рэчы Паспалітай.

**Брэсцкі (Берасцейскі) царкоўны сабор**

Галоўнымі ініцыятарамі царкоўнай уніі выступілі епіскапы Іпацій Пацей і Кірыл Цярлецкі, якіх падтрымалі мітрапаліт Міхаіл Рагоза і кароль Жыгімонт III Ваза. У пачатку 1596 г. папа Клімент VIII зацвердзіў умовы далучэння Кіеўскай мітраполіі да каталіцкай царквы. У кастрычніку **1596 г.** у Брэсце (Бярэсці) адбыўся царкоўны сабор, на якім была афіцыйна абвешчана унія праваслаўнай царквы з каталіцкай.




*Медаль з надпісам «Русіны прынятыя» (з лац.)*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, калі, пры якіх абставінах быў адчаканены медаль і што ён сімвалізуе.

**Умовы уніі**

Паводле ўмоў заключанай уніі Кіеўская мітраполія захоўвала ранейшыя царкоўныя абрады, царкоўныя святы, праваслаўныя святары былі прыроўнены ў правах да каталіцкіх святароў, на царкоўныя пасады маглі прызначацца толькі «рускія» людзі, уніятаў

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

**Апостальская канстытуцыя, зацверджаная Папам Рымскім, студзень 1596 г.**

Мы сапраўднай сваёй пастановаю прымаем вельмішаноўных братоў, Міхаіла архіепіскапа — мітрапаліта і іншых епіскапаў рускіх з усім іх клірам і народам рускім, які жыве ва ўладаннях польскага караля, ва ўлонне каталіцкай царквы, як нашых сябраў у Хрысце. І ў сведчанне такой любові да іх, з апасталічнай ласкі, дазваляем ім усе святыя абрады і цырымоніі, якія ўжываюць яны пры здзяйсненні божых службаў і свяцейшай літургіі, таксама пры здзяйсненні іншых таінстваў і іншых свяшчэннадзействаў, калі толькі гэтыя абрады не пярэчаць ісціне і вучэнню каталіцкай веры і не перашкаджаюць зносінам з рымскай царквой, — дазваляем, нягледзячы ні на якія іншыя супрацьлеглыя пастановы і распараджэнні апостальскага прастола.

*1. Якія ўмовы уніі названыя ў прыведзеным урыўку?*
*2. Чаму ўніяцкую царкву называюць грэка-каталіцкай?*

было забаронена схіляць у лацінскі абрад. Кіеўскі мітрапаліт і архірэі прызналі вяршэнства Папы Рымскага і прынялі асновы каталіцкай веры.

**Пашырэнне ўніяцтва**

**3. Станаўленне ўніяцкай царквы на тэрыторыі Беларусі.** Станаўленне ўніяцкай царквы расцягнулася амаль на стагоддзе. Зніжэння вастрыні міжканфесійнай барацьбы, якога спадзявалася ад уніі каралеўская ўлада, не адбылося. Наадварот, унія ўзмацніла гэтую барацьбу, выклікала яшчэ глыбейшы раскол у беларускім грамадстве.

Канец XVI — пачатак XVII ст. — гэта перыяд жорсткага і гвалтоўнага навязвання уніі. Улады Рэчы Паспалітай імкнуліся да таго, каб уніяцкая царква засталася адзінай законнай для праваслаўных, выкарыстоўвалі для гэтага разнастайныя метады ціску і прымусу. Праваслаўнае насельніцтва пераводзілася ва ўніяцтва. Зачыняліся праваслаўныя храмы, святары якіх адмаўляліся прымаць унію.

Чаму ідэя уніі не атрымала шырокай падтрымкі насельніцтва?

Рашэнні Брэсцкага (Берасцейскага) сабору не былі прынятыя часткай праваслаўнага грамадства. Частка шляхты, многія прадстаўнікі духавенства

## ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ ЎНІЯЦТВА

| КАНЕЦ XVI — ПАЧАТАК XVII ст. | 1630-я гг. — КАНЕЦ XVIII ст. |
| --- | --- |
| • гвалтоўны характар насаджэння;<br>• закрыццё праваслаўных цэркваў і школ;<br>• супрацьстаянне праваслаўнага насельніцтва;<br>• дзейнасць праваслаўных брацтваў | • памяркоўны характар распаўсюджвання;<br>• стварэнне манаскага ордэна базыльянаў;<br>• аднаўленне дзейнасці праваслаўнай царквы |

рашуча выступілі супраць уніі, актывізавалася дзейнасць брацтваў. Некаторыя магнаты ўзялі пад абарону праваслаўнае духавенства сваіх уладанняў. Прыкладам быў Слуцк — яго ўладальніца Соф'я Радзівіл ператварыла горад у цвярдыню праваслаўя. Адным з выбітных дзеячаў, што актыўна выступалі за адмену уніі, быў Мялецій Сматрыцкі.

У гэтых умовах кіеўскі мітрапаліт Іосіф Руцкі засяродзіўся на асвеце і прапагандзе уніі, даручыўшы гэтую задачу заснаванаму ў 1617 г. ордэну базыльянаў. Аднак метады прапаганды уніі спалучаліся з адміністрацыйным ціскам, што часцяком выклікала хваляванні і прыводзіла да ахвяр. Так, у 1618 г. адбылося выступленне гараджан у Магілёве супраць прымусовага ўвядзення царкоўнай уніі. У 1623 г. выбухнула антыўніяцкае паўстанне праваслаўнага насельніцтва ў Віцебску, падчас якога быў забіты полацкі грэка-каталіцкі епіскап Іясафат Кунцэвіч, які ўжываў надзвычай жорсткія метады падчас насаджэння ўніяцтва.

Каб паменшыць напругу ў грамадстве, у 1633 г. кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV Ваза абвясціў аб аднаўленні прававога статусу праваслаўнай царквы. Такім чынам, у Рэчы Паспалітай існавалі дзве царквы каталіцкага абраду — праваслаўная і ўніяцкая. На чале кожнай з іх стаяў мітрапаліт, аднак рэзідэнцыя праваслаўнага мітрапаліта знаходзілася ў Кіеве, а ўніяцкага — у Вільні.

### Узмацненне праяў рэлігійнай нецярпімасці

Найбольшага напалу міжканфесійная барацьба дасягнула падчас сялянска-казацкай вайны 1648–1651 гг. і вайны Расійскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. У гэты перыяд значна ўмацаваліся пазіцыі праваслаўнай царквы, якая пачала ўсё больш арыентавацца на Маскву як цэнтр праваслаўнага хрысціянства.

Спыненне баявых дзеянняў у 1667 г. карэнным чынам змяніла сітуацыю. У грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай нарасталі праявы рэлігійнай нецярпімасці: рэзка ўзмацнілася дыскрымінацыя праваслаўнай царквы.

У такіх умовах у апошняй траціне XVII — першай палове XVIII ст. уніяцкая царква пачала аказваць значны ўплыў на беларускае сялянства, мяшчанства і дробную шляхту. Уніяцкія святары, як і праваслаўныя, паходзілі з мясцовых жыхароў, і, як сяляне і гараджане, з'яўляліся носьбітамі культурных традыцый беларускага народа. Пашырэнню ўніяцтва таксама спрыяла адсутнасць істотных адрозненняў у літургіі паміж уніяцкай і праваслаўнай цэрквамі. Напачатку XVIII ст. колькасць уніяцкага насельніцтва ў Рэчы Паспалітай перавышала лік праваслаўных.

Параўнайце становішча грэка-каталіцкай царквы ў першай палове XVII ст. і ў XVIII ст.

У 1720 г. адбыўся Замойскі сабор, які ўніфікаваў рэлігійнае жыццё ўніяцкай царквы, зблізіў яе з лацінскім абрадам, пацвердзіў каталіцкія абрады і ўмацаваў царкоўную арганізацыю. Ад гэтага моманту пачалася татальная лацінізацыя і паланізацыя абрадавага боку ўніяцкай царквы. Гэта выявілася ў знішчэнні іканастасаў і змяненні вонкавага выгляду святароў. Адначасова адбываўся масавы пераход сялян з праваслаўя ва ўніяцтва.

Тым не менш на ўсёй тэрыторыі Рэчы Паспалітай, якая паступова ператваралася ў польскую дзяржаву, уніяцкая царква ўспрымалася як рэлігійная арганізацыя нацыянальнай меншасці. Таму яе епі-

скапы так і не здолелі дабіцца тых палітычных правоў, якімі валодала каталіцкае духавенства.

Канцлер ВКЛ Леў Сапега ў адказ на дзеянні ўніяцкага лідара Іясафата Кунцэвіча пісаў: «Ваша святасць, як ты яе [унію] разумееш, дазваляе вам рабаваць схізматаў (праваслаўных) і адсякаць ім галовы. Евангелле вучыць зусім іншым рэчам. Гэтая унія выклікала велізарнае няшчасце... Унія не прынесла радасці, а толькі нязгоду, сваркі, непарадкі. Было б нашмат лепей, каб яна ніколі не мела месца сярод нас...».



*Леў Сапега.*
*Паштовая марка. 1995 г.*

Існуе думка, што Брэсцкая унія, як Фларэнтыйская, не мела каранёў у праваслаўнай народнай свядомасці, была справай дзяржаўнай палітыкі Рэчы Паспалітай, а не царкоўнага прыцягнення да Рыма, і калі пашыралася, дык толькі выключна праз гвалтоўнае яе насаджэнне. Ці згодны вы з такім сцверджаннем? Свой адказ аргументуйце.

**Дысідэнцкае пытанне**

**4. Канфесіі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVIII ст.** Рэлігійная палітыка Рэчы Паспалітай, накіраваная на ўзмацненне ўплыву каталіцкай царквы і аб'яднанне вакол яе ўсяго грамадства, прывяла да абвастрэння дысідэнцкага пытання. Дзяржава шляхам паступовага абмежавання правоў дысідэнтаў, у лік якіх уваходзілі пратэстанты і праваслаўныя, намагалася схіліць іх да каталіцызму. На сярэдзіну XVIII ст. у ВКЛ засталося толькі 38 пратэстанцкіх абшчын, дзейнічала ўсяго адна праваслаўная епархія з цэнтрам у Магілёве.

У 1765 г. у Рэчы Паспалітай пачаўся шэраг рэформаў, адным з элементаў якіх было абмежаванне правоў дысідэнтаў. Гэта справакавала стварэнне шляхецкіх канфедэрацый, якія звярнуліся па дапамогу да суседніх краін. Каб пазбегнуць міжканфесійнай вайны, кароль Станіслаў Панятоўскі ўраўнаваў дысідэнтаў з каталікамі, што выклікала незадавальненне каталіцкіх магнатаў і шляхты і прывяло да першага падзелу Рэчы Паспалітай.

*Нягледзячы на верацярпімасць, што дэкларавалася ў Рэчы Паспалітай, раней самая шматлікая праваслаўная царква напрыканцы XVIII ст. апынулася на мяжы знікнення, як і пратэстанцкія плыні, а каталіцызм рэзка ўзмацніў свае пазіцыі. Усіх хрысціян-некаталікоў у Рэчы Паспалітай пачалі называць дысідэнтамі. З цягам часу іх сталі абмяжоўваць у палітычных правах, што прывяло да ўзнікнення «дысідэнцкага пытання».*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
| --- | --- |
| XVI ст. — Рэфармацыя і рэлігійныя войны ў Еўропе | 1596 — заключэнне Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Як і чаму змянілася становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XVI ст.?
2. Назавіце прычыны заключэння Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі.
3. Ахарактарызуйце асноўныя палажэнні Брэсцкай (Берасцейскай) уніі.
4. Якімі метадамі пашыралася ўніяцтва на тэрыторыі Беларусі?
5. Выкарыстоўваючы памятку на с. 300, дайце ацэнку гістарычнаму факту «Заключэнне Брэсцкай (Берасцейскай) царкоўнай уніі».